# Школьная планета

ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

**_НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!_**

**_№ 5 (43) СТУДЗЕНЬ 2018_**

_Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці_

## СПЕЦВЫПУСК

## Мінскай вобласці - 80 гадоў




***Мой родны кут, як ты мне мілы!..***
***Забыць цябе не маю сілы!***
***Не раз, утомлены дарогай,***
***Жыццём вясны мае убогай,***
***К табе я ў думках залятаю***
***І там душою спачываю.***
***О, як бы я хацеў спачатку***
***Дарогу жыцця па парадку***
***Прайсці яшчэ раз, азірнуцца,***
***Сабраць з дарог каменні тыя,***
***Што губяць сілы маладыя, –***
***К вясне б маёй хацеў вярнуцца.***



### 15 студзеня 2018 года споўнілася 80 гадоў з дня ўтварэння Мінскай вобласці

## Старонкі гісторыі Мінскай вобласці



Гістарычныя карані Мінскага краю сыходзяць углыб стагоддзяў: каля 950 гадоў таму на берагах Свіслачы з'явіліся першыя паселішчы. Яны далі пачатак і назву гораду Мінску, а пасля - і сталічнай Мінскай вобласці.

У кастрычніку-лістападзе 1917 года, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, на тэрыторыі Мінскай губерні ўсталявалася Савецкая ўлада. Была створана новая сістэма адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення. Пачатак рэформы аб адміністрацыйна-гаспадарчым дзяленні рэспублікі быў пакладзены пастановай ЦВК БССР ад 20 чэрвеня 1924 года, якая прадугледжвала стварэнне акруг замест паветаў, раёнаў - замест валасцей, стварэнне сельсаветаў. Такім чынам, намецілася тэндэнцыя да тэрытарыяльнага ўзбуйнення.

15 студзеня 1938 года Першая сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла Пастанову «Аб змяненні і дапаўненні артыкулаў Канстытуцыі СССР “АБ увядзенні ў БССР абласнога адміністрацыйнага дзялення», згодна з якім была ўтворана Мінская вобласць.




*Найбуйнейшымі прамысловымі прадпрыемствамі* абласнога значэння з'яўляліся: металаапрацоўчы, станкабудаўнічы, вагонарамонтны заводы ў г. Мінску; запалкавая і музычная фабрыкі, гарбарны завод і шклозавод у Барысаве.

*Самымі буйнымі дзяржаўнымі прадпрыемствамі па здабычы торфу* былі торфазаводы ў Смілавічах, у Мінскім і Барысаўскім раёнах.



Таксама меліся *тры вопытныя сельскагаспадарчыя станцыі:* у Лошыцы і Малай Сляпянцы. 59 машына-трактарных станцый Мінскай вобласці налічвалі 2033 трактары. Да пачатку 1939 года калектывізацыя сялянскіх гаспадарак склала 93,2%.

Вядучы напрамак сельскай гаспадаркі Міншчыны быў *«збожжа-бульбяна-жывёлагадоўчым»*. Пасяўныя плошчы вобласці складалі 735,087 га. У агульнай прадукцыі Мінскай вобласці ўдзельная вага сельскай гаспадаркі складала 20,9%.



*Вялікую ўвагу савецкая ўлада надавала адукацыі насельніцтва.* У вобласці налічвалася 1620 школ, у якіх вучылася 220930 дзяцей, 264 дзіцячых ясляў-садоў і 18 дзіцячых дамоў. Усе дзеці школьнага ўзросту былі ахоплены навучаннем.

*Сетка аховы здароўя* вобласці налічвала 54 бальніцы, 160 амбулаторый і 120 урачэбных участкаў.



Хуткімі тэмпамі *развівалася сувязь.* У вобласці налічвалася 336 прадпрыемстваў сувязі. Усе райцэнтры былі злучаныя тэлефоннай і тэлеграфнай сувяззю з абласным цэнтрам.




У 1939 годзе на тэрыторыі вобласці былі распаўсюджаны *28 рэспубліканскіх, абласных і раённых газет*, разавы тыраж якіх складаў 412,8 тыс. экзэмпляраў.

Таксама існавалі *партыйная і камсамольская арганізацыі.* У партарганізацыі на ўліку складалася 10839 членаў КПБ(б). Колькасць камсамольскіх арганізацый складала 3033, яны аб'ядноўвалі 64982 чалавека.



***22 чэрвеня 1941*** года мірная праца жыхароў вобласці, як і ўсёй краіны, была перапынена нападам фашысцкай Германіі. Праз некалькі дзён гітлераўскія войскі ўварваліся на тэрыторыю Міншчыны. На працягу васьмі дзён вобласць апынулася цалкам захопленай праціўнікам.

Нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі на тэрыторыі вобласці *лагеры смерці*, сярод іх Масюкоўшчынская, Маладзечанскі, Трасцянецкі. 157 вёсак падзялілі трагічны лёс Хатыні.






У вобласці дзейнічалі *3 партызанскія злучэнні, 45 партызанскіх брыгад*, якія аб'ядноўвалі 213 атрадаў.






*За мужнасць і гераізм*, праяўленыя ў барацьбе супраць ненавіснага ворага, больш за 80 ураджэнцаў Міншчыны былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, тысячы ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

*Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны* жыхары вобласці прыступілі да аднаўлення разбуранай гаспадаркі. Ужо да канца першай пасляваеннай пяцігодкі (1946-1950 гг.) быў дасягнуты даваенны ўзровень прамысловай вытворчасці. Была адноўлена сетка харчовых прадпрыемстваў мясцовай і кааператыўнай прамысловасці, атрымала далейшае развіццё металаапрацоўка.



За кароткі гістарычны тэрмін – у другой палове XX стагоддзя – Мінскі край стаў рэгіёнам з буйнейшым прамысловым і сельскагаспадарчым патэнцыялам, з развітай інфраструктурай, арыентаванай на агульнасаюзныя маштабы вытворчасці. Ва ўсе куткі краіны ішла прадукцыя прадпрыемстваў Міншчыны. Вобласць была неад'емнай і значнай часткай адзінага народнагаспадарчага комплексу СССР.

# Дом, у якім утульна ўсім!

berezino2.school.by vk.com/club59543714 *№ 43, студзень 2018 г.*




<u>*1 лютага 1967*</u> года за актыўны ўдзел у партызанскім руху, за мужнасць і гераізм, праяўленыя жыхарамі Міншчыны ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, і поспехі, дасягнутыя ў аднаўленні народнай гаспадаркі, <u>*Мінская вобласць Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР узнагароджана ордэнам Леніна*</u>. <u>*23 снежня 1970 года Мінская вобласць узнагароджана другім ордэнам Леніна*</u> за поспехі, дасягнутыя працаўнікамі Міншчыны ў выкананні заданняў 8-га пяцігадовага плана па развіцці прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці.

У канцы 80-х гадоў дасягнулі свайго росквіту навука, культура, адукацыя, ахова здароўя. <u>*13 студзеня 1998 года за асаблівыя дасягненні ў сацыяльна-культурным развіцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня ўтварэння Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Мінскай вобласці быў прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.*</u>

Слаўнае гістарычнае мінулае Мінскай вобласці знаходзіць годны працяг у сучаснасці Міншчыны. На сучасным этапе сталічная вобласць – адзін з найбольш эканамічна і культурна развітых рэгіёнаў Рэспублікі.

***Па матэрыялах сайта http://minsk-region.gov.by***



# Вандруем па Міншчыне...

























M4 МІНСК
P59 ЧЭРВЕНЬ МАР'ІНА ГОРКА
300м
P59 СМАЛЯВІЧЫ ЛАГОЙСК


ЧЭРВЕНЬ
1387
REALT.BY


МИНСКОЙ ОБЛАСТИ
80 лет


ВИЛЕЙКА


1501
БЕРАЗІНО


ДОБРО ПОЖАЛОВАТЬ!
КРУПКИ


1324
МЯДЗЕЛ


UNESCO
НЯСВІЖ
СУСВЕТНАЯ СПАДЧЫНА

Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 43, студзень 2018 г.














# Міншчына – наш агульны дом

ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына, Сямашка Паліна, Маркоўская Лізавета, Усачова Валерыя